# АГУЛЬНАСЛАВЯНСКАЯ СПАДЧЫНА Ў РАЗВІЦЦІ ПІСЬМЕНСТВА, МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

**М.М. Грынчык**, прафесар
Беларускага універсітэта культуры

## ГУМАНІСТЫЧНЫЯ ТРАДЫЦЫІ СТАРАБЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Місіянерская дзейнасць роўнаапостальных першаасветнікаў прападобных Кірылы і Мяфодзія, іх жыватворная дзейнасць у галіне духоўнай культуры і асветы ўсіх славянскіх народаў не мае сабе роўных як па глыбіні сваіх гуманістычных уплываў, так і па бясцэннай вартасці саміх хрысціянскіх прынцыпаў і ідэалаў. Гэтая заканамернасць надзвычай яскрава выявілася ва ўсіх усходнеславянскіх культурах, аднак у старабеларускай літаратуры, у значнай ступені ізаляванай ад антычных традыцый, царкоўнаславянскае пісьменства, яго арыгінальныя і перакладныя роды, віды стаяць ля самых вытокаў разнастайных жанравых формаў традыцый. Так, шырокавядомае "Жыціе прападобнай Ефрасінні Полацкай", дзесяткі іншых узораў жыційнай літаратуры аказалі плённы ўплыў на формы і віды старажытнай беларускай прозы таксама, як, скажам, славутыя "словы" К.Тураўскага на лірычныя жанры і ўзоры свецкай літаратуры. Генетычныя сувязі многіх жанраў з хрысціянска-рэлігійнай традыцыяй працягваюцца і паглыбляюцца паралельна з класічнымі ўзорамі старабеларускай літаратуры, асабліва лепшыя ўзоры так званай лацінамоўнай беларускай літаратуры XIV—XV стст. (Я.Вісліцкі, М.Гусоўскі).

Класічным узорам такой сувязі можна лічыць славутую паэму М.Гусоўскага "Песня пра зубра" (1525), прасякнутую духам патрыятызму і чалавекалюбства.

Пачынаючы з глыбокай старажытнасці гуманізм – гэта значыць, любоў і павага да чалавека, а шырэй – духоўная паяднанасць, калектыўная салідарнасць усіх людзей, аб'яднаных агульнымі прынцыпамі суіснавання, знешнімі ўмовамі, духоўнымі і іншымі традыцыямі з'яўляўся зыходнай маральнай асновай далейшага развіцця чалавечага грамадства.

Асноўныя прынцыпы гуманізму як філасофскай канцэпцыі былі сфармуляваны ў час антычнасці, але сваёй дэмакратычнай сутнасцю былі скіраваны супраць афіцыйнай ідэалогіі (homo homini lupus est), былі поўнасцю адкінуты, а яе прыхільнікі знішчаліся фізічна. Успомнім трагічны лёс славутага Сакрата.

У эпоху зараджэння хрысціянства і яго імклівага распаўсюджання ў Еўропе стыхійны народны гуманізм арганічна спалучаўся з хрысціянскай мараллю, становячыся асновай духоўнага выхавання, прынцыпам паводзін і ўчынкаў чалавека, створанага “па вобразе і падабенстве Божым”. Такім чынам, паступова фарміруецца даволі трывалая і паслядоўная тэорыя грамадскай салідарнасці, у аснове якой – эвалюцыйны шлях сацыяльнага і культуралагічнага прагрэсу.

Гуманізм у сферы мастацкай творчасці сярэднявечча – не толькі сацыяльна-філасофская катэгорыя, але і магутны імпульс ідэйна-эстэтычных пошукаў і абагульненняў. Яшчэ з часоў Ф.Скарыны і М.Гусоўскага ён становіцца галоўным у іх шматграннай культурна-асветніцкай і літаратурнай дзейнасці, духоўным зместам так званага першага беларускага Адраджэння. У яго аснове хрысціянскія этыка і мараль, імкненне палепшыць жыццё “люду паспалітага” шляхам гуманізацыі саслоўных адносін, усеагульнай асветы і маральнага ўдасканалення чалавека на падставе рэлігійнай этыкі. Не выпадкова адным з першых перакладаў літургічнай літаратуры з’яўляецца сілабічны верш з кнігі “Выхад”:

Веруй в Бога // единего
А не бери / надармо имени его!
Помни дни святые / святити
Отца и матку / чтити!
Не забывай / ни едина.
И не делай // греху блудна!
Не вкради, / что дружнего.
А не делай / сведецтва лживего!
Не пожелай // жены ближнего,
Ни имени / или речи его!

Такім чынам, старажытны біблейскі “запавет” становіцца асновай асветніцка-творчай дзейнасці Ф.Скарыны, духоўнага адраджэння роднага народа, рэальнай перспектывай яго духоўнага ўздыму на новым этапе гістарычнага развіцця.

Прынцыпы гэтыя выразна процістаялі тагачасным радыкальным тэндэнцыям грамадскага прагрэсу, якія найбольш адкрыта выявіліся ў сялянскіх бунтах у Паўднёвай Германіі на чале з Т. Мюнцэрам. Трагічны фінал гэтых крывавых падзей (1525), відавочна, быў улічаны беларускімі асветнікамі-гуманістамі канца XIV – пачатку XVI ст.

Выразна антываенны напрамак набываюць шматлікія публіцыстычныя заклікі М.Гусоўскага ў паэме “Песня пра зубра”:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спынім забойства! Сумленне, і розум, і гонар
Уладна загадваюць кніжніку; як са званіцы
Бі ў сваё звонкае слова, узбройвай народы
Супроць разбою! Бясконца купае і губіць
Марс збраяносны людзей у крывавых купальнях.
Свет хрысціянства з яго хрысціянскаю верай
Трэснуў даўно і расколіна ўглыб пранікае
Дома і ў войску, хістаюцца веры асновы.

Па сутнасці, у гэтых радках твора М.Гусоўскага заключаны ўвесь гуманістычны кодэкс беларускіх адраджэнцаў. У яго апошняй паэме "Жыццё святога Іякінфа" (1533) гуманістычна-выкрывальны пафас значна паглыблены, ён перанесены цалкам на сферы тагачаснага грамадскага і прыватнага жыцця, паэма месцамі дасягае выключна высокага гуманістычнага пафасу і актуальнага гучання.

Варта адзначыць, што плённыя гуманістычныя традыцыі беларускай літаратуры сярэднявечча знаходзяць арганічны працяг у рэлігійна-палемічнай літаратуры як супрацьдзеянне польска-каталіцкай экспансіі, а з 1596 г. уніяцтву. Да найбольш значных здабыткаў гэтай плыні, бясспрэчна, можна аднесці творы Хрыстафора Філалета, Лявонція Карповіча, Мялеція Сматрыцкага, Афанасія Філіповіча. Гуманістычныя здабыткі беларускіх асветнікаў і палемістаў аказаліся выключна трывалымі ў пазнейшыя гады. Нягледзячы на прыметны спад гуманістычных ідэй і матываў у гады Рэфармацыі і Контррэфармацыі, затым у перыяд дзейнасці Сімяона Полацкага, які перайшоў на аўтарытарныя пазіцыі, ідэі пачатковага гуманізму ўсё больш арганічна ўваходзяць у аснову вуснапаэтычнай творчасці. Яны трансфарміруюцца, пераасэнсоўваюцца, паступова рыхтуючы адпаведныя канцэптуальныя перадумовы для новага магутнага ўзлёту ў эпоху рамантызму.

**І.А.Чарота**, дацэнт Беларускага
дзяржаўнага універсітэта

## ЗАМЕНА ЦАРКОЎНАСЛАВЯНСКАЙ МОВЫ НА БЕЛАРУСКУЮ Ў ПРАВАСЛАЎНЫМ БОГАСЛУЖЭННІ ЯК ІДЭЯ І ЯК РЭАЛЬНАСЦЬ

Прытрымліваючыся поглядаў, выказаных на Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях 1997 г.[1], мы ўсведамляем неабходнасць

---

[1] Чарота І. Неадменнае і актуальнае значэнне Кірыла-Мяфодзіеўскай спадчыны для беларусаў // Матэрыялы Кірыла-Мяфодзіеўскіх навуковых